Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 241 (310)
ЧАЦВЕР
17
КАСТРЫЧНІКА
1940 г.

Цана 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПАД СЦЯГАМ СТАЛІНСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ

15 кастрычніка ў заходніх абласцях Украінскай і Беларускай ССР і ў Карэла-Фінскай ССР пачалася выбарчая кампанія па выбарах дэпутатаў у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных. Гэтыя выбары з'яўляюцца важнейшай палітычнай кампаніяй, да правядзення якой павінна быць прыкавана ўвага ўсіх мясцовых партыйных, советскіх і грамадскіх арганізацый. Прадстаіць выбраць многія дзесяткі тысяч новых дэпутатаў. Дастаткова ўказаць, напрыклад, што толькі ў мясцовыя Советы заходніх абласцей Украіны павінна быць выбрана каля 80.000 чалавек.

Прадстаячыя выбары па сутнасці справы завяршаць перабудову дзяржаўных органаў у новых раёнах Совецкага Саюза ў адпаведнасці з Сталінскай Канстытуцыяй. Гіганцкая арганізацыйная работа, пачатая з першых-жа дзён пасля ўстанаўлення совецкай улады, зараз атрымае закончанае і поўнае выражэнне.

Выбарчая кампанія ў Карэла-Фінскай ССР і заходніх абласцях Украіны і Беларусі адкрываецца ў перыяд гарачай творчай работы, якая ідзе зараз у гэтых месцах пад кіраўніцтвам бальшэвіцкай партыі і совецкага ўрада. Усяго трынаццаць месяцаў прайшло з таго часу, як часці Чырвонай Арміі вызвалілі насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ад панскага ярма. Яшчэ меншы тэрмін аддзяляе нас ад таго часу, калі была ўтворана Карэла-Фінская ССР, якая ўключыла ў сябе рад новых раёнаў, што адышлі да СССР па мірнаму дагавору з Фінляндыяй.

Часу прайшло нямнога. Але якія здзіўляючыя перамены ўжо адбыліся ў гэтых месцах! Бо зусім-жа нядаўна, скажам, у Заходняй Украіне тры чвэрці ўсёй зямлі належала манастырам, памешчыкам, чыноўнікам і кулакам; трэцяя частка сялян не мела ні кавалачка пахаці. Пасля прыходу Чырвонай Арміі сяляне заходніх абласцей Украіны і Беларусі атрымалі каля паўтара мільёнаў гектараў пахатных земель. На палях пявіліся трактары, камбайны і іншыя складаныя машыны. Па пачыну самі сялян створаны калгасы, якія сабралі ўжо ў гэтым годзе багаты ўраджай.

Сотні тысяч рабочых, служачых і прадстаўнікоў інтэлігенцыі, якія знаходзіліся ў кіпцюрах беспрацоўя, атрымалі работу па сваёй спецыяльнасці. У гарадах і сёлах пявіліся тысячы новых школ, клубаў, дамоў культуры, бальніц, амбулаторый і хат-чытальнь. Паўсюды ўзніклі нацыянальныя тэатры, выходзяць газеты на роднай мове. Усюды свабодна гучыць руская, украінская, беларуская, польская, яўрэйская гаворка.

Усе гэтыя перамены адбыліся пры прамой дапамозе народаў Совецкага Саюза, пры велізарным падтрыманні бальшэвіцкай партыі і совецкага ўрада. Для развіцця народнай гаспадаркі заходніх абласцей Украіны і Беларусі, раёнаў Карэла-Фінскай ССР дзяржава затрачвае мільярдныя сумы. Імення гэтай дапамогай аб'ясняецца, што за кароткі тэрмін у заходніх абласцях Украіны, напрыклад, аднаўлена каля тысячы прадпрыемстваў, якія раней бяздзейнічалі.

Пакідаючы тэрыторыю новых раёнаў Карэла-Фінскай ССР, белафіны палілі і разбуралі заводы, фабрыкі, гарады і пасёлкі. За прайшоўшыя поўтара на месяцы руін і развалін выраслі буйныя прадпрыемствы, аснашчоныя сучаснай тэхнікай. У строй дзеючых аб'ектаў уже ўступілі цэлюлёзна-папяровыя камбінаты ў Энсо і Іоханесе, напярэдадні пуску знаходзяцца камбінаты ў Кякісалмі, Піткяранце і Харлу. Поўным ходам працуюць аднаўленыя фанерныя, мэблевыя, цагельныя фабрыкі і заводы. Бесперабойна дзейнічаюць новыя чыгуначныя магістралі Петразаводск — Суаярві — Сартавала, Ленінград — Віпуры, Ленінград — Кякісалмі — Сартавала.

Працоўныя новых раёнаў Совецкага Саюза наглядна пераканаліся, што дае ім совецкая ўлада. Вызваліўшы народы гэтых раёнаў ад прыгнёту капіталістаў і памешчыкаў, совецкая дзяржава дала працоўным усе неабходныя для пабудовы свайго жыцця на новых пачатках, на іншых асновах, якія прынцыпова адрозніваюцца ад ранейшых.

Праходзіўшыя ў гэтым годзе ў Карэла-Фінскай ССР, заходніх абласцях Украіны і Беларусі выбары ў Вярхоўныя Советы ператварыліся ў сапраўды народнае свята. У выбарчых акругах заходніх абласцей Украіны і Беларусі ў выбарах прыняло ўдзел 96 і больш процантаў агульнага ліку выбаршчыкаў. У Карэла-Фінскай ССР галасавала 99,67 процанта ўсіх зарэгістраваных выбаршчыкаў. Усюды былі выбраны кандыдаты сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Не залішне напомніць, што на апошніх выбарах у польскі сейм удзельнічала не больш 45 процантаў выбаршчыкаў, а ў некаторых раёнах гэта лічба зніжалася да 3 процантаў.

Цяпер насельніцтва Карэла-Фінскай ССР, заходніх абласцей Украіны і Беларусі на аснове самай дэмакратычнай у свеце Канстытуцыі прыступае да выбараў сваіх прадстаўнікоў у мясцовыя органы ўлады. Можна смела сказаць, што людзей, якія варты звання дэпутатаў мясцовых Советаў, на справе даказалі сваю адданасць радзіме, знойдзецца нямала ў кожным горадзе, раёне, сяле.

За прайшоўшыя месяцы ў новых раёнах СССР многія тысячы людзей далучыліся да дзяржаўнай дзейнасці. У адной толькі Львоўскай вобласці вылучана на кіруючую работу каля дзесяці тысяч чалавек. У Валынскай вобласці колькасць вылучэнцаў таксама вымяраецца тысячамі. Былыя безыменныя рабочыя сталі начальнікамі цэхаў, дырэктарамі заводаў і фабрык, сяляне ўзначальваюць работу калгасаў.

Лепшыя з лепшых, верныя сыны і дочкі народа будуць пасланы ў мясцовыя органы ўлады. Дэпутатамі павінны быць выбраны самыя актыўныя барацьбіты за шчасце працоўных, якія зарэкамендавалі сябе і ў годы барацьбы з ненавісным прыгабашчыкамі пры старым ладзе, і ў месяцы творчай, будаўнічай работы пры совецкай уладзе. У Советы трэба пасланаць актыўных, працаздольных людзей, чэсных і праверанных, для якіх інтарэсы радзімы вышэй за ўсё на свеце.

Таму адным з самых адказных этапаў пачатай кампаніі з'яўляецца вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты і перадвыбарчая агітацыя. Тут асабліва неабходны дыферэнцыраваны падход, чуткае і папулярнае раз'ясненне ўсіх пытанняў. Агітацыя павінна быць канкрэтнай, аснованай на дакладным веданні становішча ў тым ці іншым раёне. Нельга забываць і аб тым, што захаваўшыяся аскалкі разбітых варожых класаў будуць прабаваць пашкодзіць паспяховаму ходу выбараў, апарочыць кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Партыйныя і совецкія арганізацыі павінны праявіць высокую пільнасць і аператыўнасць, удзяліць выключную ўвагу якасці масава-агітацыйнай работы.

Правядзенне выбарчай кампаніі немысліма без актыўнага ўдзелу ў ёй усіх перадавых людзей горада і вёскі. Зараз у Тарнопальскай вобласці ёсць каля 20.000 агітатараў, у Ровенскай вобласці — 13.000. Гэта мала. Да агітацыйна-масавай работы трэба прыцягнуць свежыя сілы. Адных толькі членаў акруговых і участковых выбарчых камісій у заходніх абласцях Беларусі патрабуецца больш 185.000 чалавек.

У час выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і саюзных рэспублік вылучыліся сотні тысяч актывістаў. На жаль, гэты велізарны актыў у многіх месцах разгублен. Так абстаіць справа, напрыклад, у некаторых раёнах Тарнопальскай, Брэсцкай абласцей і ў іншых месцах. Неабходна зараз-жа, у першыя дні выбарчай кампаніі, адшукаць гэтых людзей, прыцягнуць іх у выбарчую работу, прыцягнуць сотні тысяч новых актывістаў. Трэба памятаць, што без дапамогі самых працоўных нельга забяспечыць высокі ўзровень падрыхтоўкі да выбараў, беззаганнае правядзенне выбарчай кампаніі.

Пастанова аб выбарах у мясцовыя Советы з вялікай радасцю сустрэнута насельніцтвам заходніх абласцей УССР і БССР і працоўнымі Карэла-Фінскай рэспублікі. Ва Львове, Беластоку, Петразаводску, Драгобычы, Віпуры, Роўне і многіх іншых месцах адбыліся шматлюдныя мітынгі, якія сведчаць аб тым, з якой зацікаўленасцю працоўныя чакаюць прадстаячых выбараў.

У сваіх рэзалюцыях працоўныя аднадушна вітаюць пачатак выбарчай кампаніі, абяцаюць пасылаць у мясцовыя советы людзей, да канца адданых справе партыі Леніна—Сталіна.

Гэта палітычная актыўнасць шырокіх мас з'яўляецца залогам таго, што народ пашле ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных дастойных дэпутатаў. Выбары яшчэ раз прадэманструюць магутнасць і сілу Совецкага Саюза, перамогі ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, якая забяспечвае брацкае садружэства ўсіх народаў, што жывуць і працуюць пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі.

(Перадавы артыкул «Праўды» за 16 кастрычніка).

У АБКОМЕ КП(б)Б

15 кастрычніка ў абкоме КП(б)Б адбылася абласная нарада сакратароў гаркомаў і райкомаў партыі. З дакладам аб падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных на нарадзе выступіў старшыня абласнога выканаўчага камітэта тав. Мальцаў.

Аб практычных мерапрыемствах па правядзенню выбарчай кампаніі гаварылі ў сваіх выступленнях сакратар абкома КП(б)Б тав. Сямёнаў, сакратар Заблудаўскага райкома КП(б)Б тав. Марголін, сакратар Чыжаўскага райкома тав. Талкачоў і іншыя.

У заключэнне нарады з прамовай выступіў сакратар абкома КП(б)Б тав. Кісялёў. Гаворачы аб задачах партыйных арганізацый у правядзенні выбарчай кампаніі, тав. Кісялёў звярнуў увагу прысутных на тое, каб гаркомы і райкомы ўлічылі вопыт кампаніі па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР, каб партыйныя арганізацыі і ўсе комуністы працавалі чотка і аператыўна.

* * *

Увечары 15 кастрычніка ў абкоме КП(б)Б адбылася таксама нарада кіраўнікоў абласных профсаюзных і грамадскіх арганізацый. Абмяркавана адно пытанне —аб удзеле ў кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Аб задачах профсаюзных і грамадскіх арганізацый у выбарчай кампаніі расказаў загадчык арганізацыйна-інструктарскім аддзелам тав. Сямёнаў.

У спрэчках выступілі, што некаторыя профсаюзныя і грамадскія арганізацыі ў выбарчую кампанію ўключыліся з усёй сур'ёзнасцю. У радзе месц прыступілі да вылучэння агітатараў, стварыўшы гурткі па вывучэнню Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах. Аб гэтым гаварылі старшыня абласнога камітэта фізкультуры і спорту тав. Мяжэвіч, старшыня профсаюза работнікаў лесу і сплаву тав. Раманаў, старшыня абкома МОПР'а тав. Каплан і іншыя. Абласная мопраўская арганізацыя ўжо вылучыла для работы на выбарчых участках 600 чалавек з свайго актыва.

Гарадская нарада сакратароў пярвічных партарганізацый

Беластоцкі гарком КП(б)Б правёў гарадскую нараду сакратароў пярвічных партыйных арганізацый. Сакратар гаркома КП(б)Б тав. Раманаў расказаў аб тых мерапрыемствах, якія намечаны гаркомам у сувязі з пачаўшайся выбарчай кампаніяй. У бліжэйшыя дні будуць праведзены агульнагарадскі сход агітатараў і нарады старшынь фабзаўмясцкомаў, рэдактараў насценгазет. Днямі пачнуць работу без адрыву ад вытворчасці курсы агітатараў. На прадпрыемствах, у кінотэатрах і некаторых установах арганізуюцца сталы даведак і кансультацый.

Па-бальшэвіцку правядзем кампанію выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных!

ПАШЛЁМ У СОВЕТЫ ЛЕПШЫХ ЛЮДЗЕЙ

ГРОДНА. (Па тэлефону ад нашага карэспандэнта). Працоўныя Гродна горача сустрэлі Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб дні выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

На прадпрыемствах і ва ўстановах у абедзенны перапынак і пасля работы праходзяць мітынгі. Рабочыя і служачыя аднадушна вітаюць Указ і бяруць на сябе абавязацельства па-бальшэвіцку правесці выбары.

Выступіўшы на мітынгу начальнік змены шклозавода тав. Мілючэнка сказаў:

— З вялікай радасцю я сустрэў Указ. Гэта будуць першыя выбары ў мясцовыя Советы на аснове самай дэмакратычнай Сталінскай Канстытуцыі. Мы будзем выбіраць лепшых сваіх людзей, якія будуць клапаціцца аб нашых патрэбах.

У часць знамянальнага дня выбараў і вялікага свята Кастрычніцкай рэволюцыі мы абавязуемся выканаць гадавую праграму да 15 снежня.

Стаханавец 5-га скуразавода тав. Яноўскі заявіў на мітынгу:

— Раней, пры польскіх панах, калі мы выбіралі гарадскую ўправу, нас прымушалі галасаваць за фабрыкантаў і заводчыкаў. Ранейшая гарадская ўправа абараняла інтарэсы буржуазіі, з'яўлялася іх арганізацыяй.

Мы паспяхова правялі выбары ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР. У нас ёсць ужо вопыт работы. Гэты вопыт выкарыстаем для таго, каб паспяхова правесці выбары ў мясцовыя Советы.

У прынятай рэзалюцыі рабочыя пішуць: «Горача вітаем Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб выбарах у мясцовыя Советы. Мы шчаслівыя і гардзімся тым, што пашлём сваіх прадстаўнікоў у Советы дэпутатаў працоўных. Выбары адзначым новымі вытворчымі перамогамі». У нас цяпер больш паловы рабочых — стаханаўцы і ўдарнікі. Лік стаханаўцаў і ўдарнікаў павялічым яшчэ больш, дадзім дзяржаве прадукцыі звыш плана на 150 тысяч рублёў.

ДАДЗІМ ЗВЫШ ПЛАНА 75.000 МЕТРАЎ ТКАНІНЫ

Каля 300 чалавек рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў 1-га тэкстыльнага камбіната сабраліся на мітынг, прысвечаны пачатку выбарчай кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Мітынг адкрыў намеснік сакратара пярвічнай партыйнай арганізацыі камбіната тав. Матвееў. Затым слова прадастаўляецца прадстаўніку гарадскога камітэта партыі тав. Кіркаешта.

— Рашэннем Прэзідыума Вярхоўнага Совета Беларускай ССР,— гаворыць тав. Кіркаешта,— у заходніх абласцях БССР на 15 снежня 1940 года назначаны выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. На аснове Канстытуцыі СССР выбары ў нас з'яўляюцца роўнымі, прамымі і тайнымі.

На трыбуне стаханавец маладзёжнай брыгады тав. Цікоцкі. Ён гаворыць аб тым, як праходзілі выбары ў былой Польшчы. Памешчыкі і капіталісты выбіралі тых людзей, якія былі зацікаўлены ў абароне іх інтарэсаў. Рабочы клас і сялянства былі бяспраўнымі. Цяпер, калі нам прадастаўлена права выбіраць, мы абавязаны паслаць лепшых сыноў рабочага класа. Мы, рабочыя першага камбіната, абавязваемся павысіць прадукцыйнасць працы і штодзенна перавыконваць свой план.

Тав. Баршчэўская—работніца ткацкага цэха—з хваляваннем расказвае аб радасных днях выбараў у Народнае Сабранне, у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных з'яўляюцца ўжо трэцімі выбарамі за год існавання совецкай улады. Раней таксама праходзілі выбары, — гаворыць тав. Баршчэўская,—у так званыя гарадскія думы. Туды траплялі толькі кліка памешчыкаў і фабрыкантаў—прадстаўнікі маёмных класаў. Цяпер выбары свабодныя, пабудованыя на дэмакратычных пачатках.

Наша задача—не дапусціць чужыя нам элементы ў Советы. Могуць быць выпадкі, калі былыя бундаўцы, пэпэсаўцы захочуць пралезці ў нашы кіруючыя совецкія органы, і мы ўсяляк павінны іх выкрываць. Пашлём у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных лепшых людзей, якія будуць абараняць нашы інтарэсы—інтарэсы рабочага класа, якія змогуць забяспечыць ператварэнне Беластока ў другое Іванава. Мы ўсе будзем актыўна прымаць удзел у агітацыйнай рабоце ў час выбараў, будзем змагацца за павелічэнне колькасці і якасці выпускаемай прадукцыі.

У прынятай рэзалюцыі рабочы калектыў абавязваецца, рыхтуючыся да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, выканаць гадавы план да 15 снежня 1940 года, даць краіне звыш плана 75.000 метраў тканіны. Яшчэ шырэй разгарнуць социялістычнае спаборніцтва і стаханаўскі рух, павысіць прадукцыйнасць працы. Лік стаханаўцаў і многастаночнікаў давесці да 600 чалавек.

ПЛЮШАВІКІ ВІТАЮЦЬ УКАЗ АБ ВЫБАРАХ

Скончылася работа першай змены. Рабочыя і работніцы сабраліся ў ткацкім цэху каля машын. Інжынер тав. Тімафееў растлумачвае значэнне Указа аб выбарах у мясцовыя Советы. Ён заклікае ўсіх рабочых і работніц актыўна ўключыцца ў выбарчую кампанію і сустрэць дзень выбараў новымі вытворчымі перамогамі.

— Мы ведаем, як выглядалі гарадскія «рады» і магістраты пры ўладзе капіталістаў, — гаворыць майстар тав. Ольшэўскі.—Зразумела, што туды рабочыя мала цікавіліся выбарамі і рэдка іх удзельнічалі. Зараз становішча зусім іншае. Советы дэпутатаў працоўных — гэта органы нашай улады, улады народа.

Яркім і хвалюючым было выступленне ткача тав. Майхшака.

— На Захадзе бушуе полымя імперыялістычнай вайны,—гаворыць тав. Майхшак. — Там штодзённа гінуць тысячы рабочых і сялян, бо гэта адпавядае інтарэсам капіталістаў і памешчыкаў. Таму, што мы можам спакойна працаваць, будаваць соцыялістычнае грамадства, мы абавязаны совецкаму ўраду і мудрай сталінскай палітыцы міру.

Калі мы раней вылучалі нашых рабочых прадстаўнікоў на выбарах у сейм або ў гарадскія самаўпраўленні, іх арыштоўвалі, кідалі ў турмы і канцэнтрацыйныя лагеры. Сёння мы можам і будзем свабодна выбіраць і пашлём у мясцовыя Советы сваіх сапраўдных прадстаўнікоў — лепшых сыноў і дачок народа.

— Я памятаю, як раней, пры капіталізме ў час выбараў дзейнічалі варожыя рабочаму класу партыі, — гаворыць работніца тав. Фрончак,— гэтыя розныя озонаўцы, эндэкі і іх слугі—правадыры ППС. Яны імкнуліся ашукаць народ, расколоць рабочы клас. Я працавала тэкстыльшчыцай у Лодзі і помню, як гэтыя халопы буржуазіі забілі ў 1938 годзе ў час выбарчай кампаніі двух рэволюцыйных рабочых. Гэтага ўжо ніколі не будзе!

У аднадушна прынятай рэзалюцыі рабочыя вітаюць Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб выбарах у мясцовыя Советы ў заходніх абласцях Беларусі, — мы прымем у выбарах самы актыўны ўдзел, яшчэ цясней згуртуемся вакол партыі бальшэвікоў. 23-ю гадавіну Кастрычніцкай рэволюцыі і разгортванне выбарчай кампаніі адзначым павелічэннем прадукцыйнасці працы, выканаем гадавы план вытворчасці да дня выбараў — 15 снежня.

Рабочыя апрэтурна-фарбоўчага цэха выклікалі рабочых ткацкага цэха на соцыялістычнае спаборніцтва ў чэсць выбараў у мясцовыя Советы за лепшыя вытворчыя паказчыкі. Калектыў ткацкага цэха выклік прыняў.

ПАЧАЛАСЯ ВЯЛІКАЯ ПЕРАДВЫБАРЧАЯ РАБОТА

(Гутарка з старшынёй абласнога выканаўчага камітэта тав. Мальцавым).

Працоўныя вобласці — рабочыя, калгаснікі, сяляне-аднаасобнікі і інтэлігенцыя—з вялікай радасцю сустрэлі Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб пачатку выбарчай кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. У гарадах і раёнах, на прадпрыемствах, у калгасах і вёсках адбываюцца сходы і мітынгі, прысвечаныя пачатку выбарчай кампаніі. На мітынгах і сходах выступаюць стаханаўцы, лепшыя рабочыя, калгаснікі, інтэлігенты. У сваіх прамовах яны заклікаюць народ добра падрыхтавацца да выбараў, аддаць свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. У рэзалюцыях працоўныя абавязваюцца дзень выбараў сустрэць выкананнем і перавыкананнем гадавых вытворчых планаў.

У нашай вобласці будзе арганізавана 93 выбарчых акругі па выбарах у абласны совет, каля 780 акруг па выбарах у гарадскія советы, больш тысячы выбарчых акруг у раённыя і каля 8.600 выбарчых акруг па выбарах у сельскія і пасялковыя советы. Выбарчыя акругі ў сельскія мясцовасцях ствараюцца ў буйнейшых населеных пунктах па магчымасці бліжэй да чыгунак і шасейных дарог.

Працоўныя прыступілі да вылучэння сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі. Усяго будзе вылучана больш 45 тысяч чалавек. У члены камісій вылучаюцца стаханаўцы і ўдарнікі прадпрыемстваў і калгасаў, перадавыя прадстаўнікі інтэлігенцыі і сялян.

Актыўным удзелам у выбарчай кампаніі працоўныя Беластоцкай вобласці яшчэ раз прадэманструюць сваю згуртаванасць вакол вялікай партыі Леніна—Сталіна, пакажуць сваё маральна-палітычнае адзінства і арганізаванасць. Як і ў папярэдніх выбарах, яны аддадуць свае галасы за верных сыноў і дачок народа — кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Прадстаячыя выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных поўнасцю завяршаць перабудову дзяржаўных органаў вобласці ў адпаведнасці з Сталінскай Канстытуцыяй.

—о—

Лепшых людзей — у выбарчыя камісіі

Рабочыя, служачыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі 3-га тэкстыльнага камбіната вылучылі ў састаў абласной камісіі па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных. У горадзе, сельскіх сомар'яна Іосіфаўна Каліноўская. Тав. Каліноўскі з'яўляецца старым рабочым, мае 28 год вытворчага стажу і прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці камбіната.

Прадстаўніком у абласную камісію ад калектыва 1-га тэкстыльнага камбіната вылучана стаханаўка-вылучэнка Ізабела Андрэеўна Якубоўская.

—0—

Першыя дні выбарчай кампаніі ў Лапскім раёне

(Гутарка з старшынёй Лапскага райвыканкома тав.Вярбіцкім).

Працоўныя Лапскага раёна з выключнай радасцю сустрэлі пачатак выбарчай кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. У горадзе, сельскіх советах, калгасах і вёсках праходзяць шматлюдныя мітынгі. Актыўнасць насельніцтва выключна вялікая.

У раёне прыступілі да арганізацыі ўчастковых і акруговых камісій. Да работы ў камісіях прыцягваецца звыш 2.000 чалавек. Ужо вылучаны прадстаўнікі ў састаў акруговых камісій па выбарах у раённы і абласны совет.

На выбарах у раённы совет ствараецца 58 выбарчых акруг, у сельскія советы—382.

Раён разбіваецца на 28 выбарчых участкаў. Для ўчасткаў падбіраюцца і абсталёўваюцца памяшканні.

Усюды адчуваецца вытворчы ўздым. Рабочыя на фабрыках абавязваюцца датэрмінова выканаць гадавыя вытворчыя планы.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ



У мінскім Доме партыйнай асветы. Групавая кансультацыя слухачоў універсітэта марксізма-ленінізма выхаднога дня па VIII раздзелу «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Злева — кансультант Г. М. Лукін. Фота Б. Вернера. Фотахроніка БЕЛТА.

Работа нашага агіткалектыва

За перыяд выбарчых кампаній па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР да актыўнай грамадскай работы прыцягнуты дзесяткі лепшых людзей. Значна вырас таксама і іх ідэйна-палітычны ўзровень. Яны паказалі сябе, як палкія патрыёты.

Як толькі я прыехаў у сельскі Совет, адразу стаў знаёміцца з агітатарамі, стараючыся ўсіх іх скарыстаць на рабоце. У сельсовеце была праведзена нарада агітатараў. Падрабязна абмеркавалі планы работы агіткалектыва. Усіх агітатараў прымацавалі да ўчасткаў і вёсак. Кожнаму былі дадзены канкрэтныя заданні па правядзенню агітацыйнай работы.

Усяго наш агіткалектыў налічвае 25 агітатараў. З імі рэгулярна праводзім семінары і нарады. На семінарах і нарадах вывучаны матэрыялы XVIII з'езда КП(б)Б, пятай, шостай і сёмай Сесій Вярхоўнага Совета СССР. Акрамя таго, сістэматычна знаёмім агітатараў з пытаннямі міжнароднага становішча. Пасля семінараў агітатары праводзяць гутаркі ў вёсках з насельніцтвам. Наша агітацыйная работа цесна спалучаецца з выкананнем гаспадарчых і палітычных задач.

У сельскім совеце, дзе працуе кіруемы мной агіткалектыў, пражывае многа польскага насельніцтва. У сувязі з гэтым асаблівая ўвага намі звернута на падбор агітатараў з працоўных палякаў.

Самым лепшым вынікам нашай работы з'яўляецца рост людзей і прыцягненне іх да актыўнага палітычнага жыцця. Вялікай папулярнасцю сярод сялян вёскі Мечы карыстаецца агітатар тав. Чахоцкі. Ён рэгулярна праводзіць гутаркі і чытку газет. Яго гутаркі даходчывыя і зразумелыя сялянам. Да яго сяляне прыходзяць за парадамі. Да занятак тав. Чахоцкі сур'ёзна рыхтуецца. Ён чытае многа мастацкай літаратуры, вывучае гісторыю партыі.

Добра працуе агітатар вёскі В. Пятроўск былы батрак тав. Каленкевіч. На канкрэтных прыкладах тых змяненняў, якія адбыліся пасля вызвалення Заходняй Беларусі ад памешчыкаў і капіталістаў, расказвае аб шчаслівым новым жыцці сялянства, мабілізуе іх на выкананне гаспадарча-палітычных задач.

Да агітацыйнай работы ў агіткалектыў прыцягнута чатыры жанчыны. Лепшым агітатарам з іх з'яўляецца тав. Завістоўская (в. Кусаўка). Акрамя агітацыйнай работы, агітатары актыўна ўдзельнічаюць у рабоце сельскага совета.

Зараз, у сувязі з набліжэннем гадавіны Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі і пачатку выбарчай кампаніі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, агітатары прыступілі да правядзення гутарак аб Вялікай пролетарскай рэволюцыі, аб поспехах, якія дасягнуты совецкай краінай, расказваюць сялянах аб значэнні першых выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных па Сталінскай Канстытуцыі.

Упэўнены, што выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных правядзем па-большэвіцку, забяспечым перамогу блока комуністаў і беспартыйных.

Ф. Рыбакоў,
кіраўнік агіткалектыва Мечанскага сельсовета, Граеўскага раёна.

Таварыскае субяседванне

У часці, дзе інструктарам па прапагандзе тав. Рыжкоў, часта праводзяцца таварыскія субяседванні байцоў і камандзіраў, вывучаючых гісторыю партыі. Таварыскае субяседванне дапамагае лепш усвоіць матэрыял, выясніць незразумелыя пытанні. Таварыская абстаноўка дазваляе самым «пасіўным» таварышам забыць пра сваю нясмеласць і прыняць удзел у абмеркаванні пытання.

Так, напрыклад, па пытанню аб розніцы паміж народнікамі 70-х і 90-х гадоў і іх памылковых поглядах і метадах барацьбы выступіла 6 чалавек, прычым некаторыя таварышы выступалі па некалькі разоў. Не меншую цікавасць выклікала пытанне аб прычынах расколу РСДРП на большэвікоў і меншавікоў на 2-ім з'ездзе партыі. Выступалі тт. Марозаў, Парошын, Маўмотаў і іншыя. Усе прысутныя асталіся задаволенымі субяседваннем.

Неабходна часцей практыкаваць таварыскія субяседванні з самастойна вывучаючымі «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», ставіць на субяседваннях канкрэтныя пытанні, вучыць уменню выказваць свае думкі, рабіць абагульненні.

Г. Шыленка.

Аб агітатарах і агітацыйнай рабоце ў Граеўскім раёне

Член Папоўскага сельсовета тав. Валендзік сур'ёзна і ўпорна працуе над сабой. Яна вывучае гісторыю партыі, мастацкую літаратуру. Яе часта можна бачыць у раённым цэнтры ў пошуках неабходнай літаратуры, у парткабінеце, куды яна прыходзіць на кансультацыю. У перыяд выбарчай кампаніі бядначка Валендзік зарэкамендавала сябе добрым агітатарам. Яна на сваёй роднай мове даводзіць да свядомасці кожнага слухача мерапрыемствы партыі і ўрада, растлумачвае міжнароднае становішча.

Жыхары вёскі Папова з задаволеннем адклікаюцца аб жывых і цікавых гутарках, якія праводзіць сярод іх тав. Валендзік. У гутарках агітатар прыводзіць многа прыкладаў з жыцця сваёй вёскі. У хатах сваіх аднавяскоўцаў яе сустракаюць, як жаданага госця. Яна блізкая сялянам, яе ўсе добра разумеюць, да яе прыходзяць сяляне нават другіх вёсак за парадамі. Сярод насельніцтва тав. Валендзік карыстаецца заслужаным аўтарытэтам і павагай.

У сельскіх советах і вёсках часта бывае інспектар райана тав. Сканецкі. Ён з'яўляецца агітатарам і лектарам на антырэлігійныя тэмы. Да сваіх лекцый і гутарак ён старанна рыхтуецца. Перад кожнай лекцыяй і гутаркай тав. Сканецкі складае канспект. Так як у раёне многа насельніцтва польскай нацыянальнасці, то ён выступае на польскай мове. Яго словы даходзяць да слухачоў, выклікаюць у іх актыўнасць. Слухачы задаюць дзесяткі пытанняў агітатару.

Такіх майстраў большэвіцкага слова за мінулы год у раёне вырасла нямала. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца імёны агітатараў тт. Свідэрскай, Рамаўскай, Фількінскага, Борыс і іншых. Усяго ў раёне ёсць звыш 300 агітатараў, прапагандыстаў, чытчыкаў. Пры іх дапамозе партыйная арганізацыя мацуе сувязь з масамі, мабілізуе масы на паспяховае выкананне стаячых задач.

Поспехі прапагандысцкай і агітацыйнай работы ў раёне былі-б значна большымі, калі-б райком партыі смялей прыцягваў да гэтай работы новы вырасшы актыў.

Ёсць 21 агіткалектыў. Але ў некаторых з іх работа яшчэ не пастаўлена на належную вышыню.

Работнікі райкома партыі мала працуюць з мясцовымі агітатарамі. І калі іх запытаеш, хто з'яўляецца лепшым агітатарам сярод насельніцтва, яны называюць 4—5 прозвішчаў. Загадчык аддзелам прапаганды і агітацыі райкома партыі тав. Цараў усё яшчэ падбірае групу агітатараў і прапагандыстаў, якія будуць чытаць лекцыі і даклады сярод насельніцтва на польскай і яўрэйскай мовах. Пры гэтым ён робіць спасыланні на недахоп агітацыйных кадраў і не заўважае вырасшых добрых прапагандыстаў і агітатараў.

У раёне выдаецца газета «Новае жыццё». Але яна яшчэ не стаіць на вышыні патрабаванняў тых задач, якія да яе прад'яўляюцца партыяй і насельніцтвам. Газета вельмі слаба займаецца пытаннямі прапаганды і агітацыі.

Цяпер пачалася кампанія па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Неабходна, каб райком партыі прыняў усе меры да арганізацыі большэвіцкай прапаганды і агітацыі сярод насельніцтва раёна. Кадраў агітатараў у раёне ёсць дастаткова. Патрэбна толькі прыцягнуць іх да работы, дапамагчы ім, і поспех справы будзе забяспечан. Працоўныя Граеўскага раёна прыдуць да выбарчых урнаў згуртаванымі вакол вялікай партыі Леніна—Сталіна.

В. Гарбанёў.

Вывучаюць тэорыю большэвізма

Гісторыю большэвіцкай партыі многія байцы і малодшыя камандзіры часці, якой камандуе тав. Чэрных, вывучалі яшчэ да прыходу ў Чырвоную Армію. Аднак з прыходам у часць яны зноў узяліся за глыбокае вывучэнне тэорыі і гісторыі большэвізма, узбагачаючы свае веды самастойным вывучэннем не толькі «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», а і асобных твораў класікаў марксізма-ленінізма.

Чырвонаармеец комуніст тав. Балян гісторыю партыі пачаў вывучаць яшчэ ў 1930 годзе. Вывучаў у гуртках, у навучальнай установе і самастойна. Вывучаючы, прыходзілася карыстацца featureрознай літаратурай, што часта не давала сістэматызацыі засвоенага матэрыялу. Больш таго, рад істотных пытанняў асталіся для яго няяснымі. Так, напрыклад, ён слаба разбіраўся ў розніцы паміж народнікамі 70-х і 90-х гадоў, недастаткова ўясняў сабе некаторыя пытанні па Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Усё гэта ён вывучыў і выдатна засвоіў ужо ў армейскіх умовах, самастойна працуючы над «Кароткім курсам», карыстаючыся дадаткова першакрыніцамі.


Вывучэнне «Кароткага курса» намнога расшырыла палітычны кругазор тав. Баляна. Ён падрабязна вывучыў рэволюцыйную дзейнасць правадыра народаў таварыша Сталіна, яго ролю ў стварэнні партыі большэвікоў.

Вялікую дапамогу ў самастойным авалоданні тэорыяй большэвізма тав. Баляну аказваюць лекцыі, гутаркі і кансультацыі па пытаннях гісторыі партыі і рэволюцыйнага руху пролетарыята, чытанне мастацкіх твораў М. Шолахава, Н. Астроўскага, М. Горкага і іншых пісьменнікаў.

Сістэматычна працуе над вывучэннем гісторыі партыі малодшы камандзір-комсамолец тав. Малышаў. Самастойна працуючы над кнігай, ён навучыўся коратка і разам з тым, не ўпускаючы нічога важнага, канспектыраваць вывучаемы матэрыял. Перш чым сесці за складанне канспекта, тав. Малышаў уважліва прачытвае раздзел, усведамляе сабе асноўную думку яго і затым ставіць рад пытанняў, на якія піша кароткія адказы. Акрамя таго, пры вывучэнні кожнага раздзела, ён дадаткова карыстаецца працамі класікаў марксізма-ленінізма. Тав. Малышаў прачытаў і заканспектыраваў творы Леніна «Што рабіць?», «Крок наперад, два крокі назад», «Дзве тактыкі соцыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэволюцыі».

Так армейскія большэвікі, партыйныя і непартыйныя, авалодваюць тэорыяй большэвізма, павышаюць свой ідэйна-палітычны ўзровень.

А. Окунеў.



У новаабсталяваным прадзільным цэху 4-га беластоцкага тэкстыльнага камбіната. Фота А. Сапіра.

Пачатак вялікай работы

XVIII з'езд ВКП(б) паставіў перад рабочымі і інжынерна - тэхнічнымі работнікамі тэкстыльнай прамысловасці вялікія задачы па ўздыму прадукцыйнасці працы.

Справа падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў на прадпрыемствах, асабліва ва ўмовах заходніх абласцей БССР, з'яўляецца адказным участкам работы, важнейшым звяном паднящця прадукцыйнасці працы і стварэння ўмоў для разгортвання стаханаўскага руху. Ажыццяўляючы ўказанні партыі і ўрада аб павышэнні тэхнічнай граматнасці рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў на прадпрыемствах тэкстыльнага трэста, на супраслеўскім тэкстыльным камбінаце ствараецца некалькі відаў тэхнічнай вучобы. Асноўным і масавым відам вучобы з'яўляецца тэхмінімум.

Вучоба ў гуртках тэхмінімума прыносіць ужо свае першыя вынікі. Частка рабочых сельфактарнага цэха перайшла на ўшчыльненую работу. Прысучалкі М. Гайдук, Бейтман і іншыя замест 165 верацён абслугоўваюць 260 верацён, выконваючы план на 104 процанты. 25 ткачоў працуюць на двух станках і выконваюць заданні на 105—110 і больш процантаў. Ткачы Грабаеўскі, Картач, Штурмак, Янушка свой вопыт сталі перадаваць адстаючым ткачам.

На камбінаце арганізоўваюцца кароткатэрміновыя стаханаўскія школы.

Вялікую ролю ў разгортванні стаханаўскага руху павінны адыграць майстры. Майстар павінен клапаціцца аб разгортванні стаханаўскай ініцыятывы, аб стварэнні неабходных умоў для пашырэння многастаночнага абслугоўвання. Майстар, памочнік майстра павінны паўсядзённа дапамагаць наватарам вытворчасці. Створаны курсы павышэння кваліфікацыі інжынерна-тэхнічных работнікаў-практыкаў. Частка інжынерна-тэхнічных работнікаў з'яўляюцца студэнтамі Ўсесаюзнага тэкстыльнага інстытута.

Зараз на камбінаце арганізуецца група інжынерна-тэхнічнага абучэння. Асобныя члены яе вядуць даследчую работу і рыхтуюць даклады, кіруюць гурткамі па тэхмінімуму. Таварышы Глікcман і Зайдэль актыўна ўдзельнічаюць у рабоце метадычнага бюро камбіната. Поспехі ў справе тэхнічнага абучэння і стаханаўскага руху могуць быць яшчэ большымі, калі ў дастатковай меры будзе аказана дапамога з боку партыйнай і профсаюзнай арганізацыі. Трэба сказаць, што да гэтага часу такой дапамогі не адчувалася. Фабком ні разу не абмяркоўваў пытання аб тэхнічнай вучобе і развіцці стаханаўскага руху. На камбінаце налічваецца 112 чалавек непісьменных і 93 чалавекі малапісьменных. Аднак па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці нічога не робіцца.

Задача дырэкцыі камбіната — забяспечыць больш хуткае асваенне новых норм усімі рабочымі, поўнасцю скарыстаць творчую актыўнасць мас і дабіцца датэрміновага выканання і перавыканання плана чацвертага квартала 1940 года.

Н. Гушчын.

Рэканструкцыя гродненскага лесапільнага завода № 7

Поўным ходам ідуць работы па рэканструкцыі гродненскага лесазавода № 7. План рэканструкцыі прадугледжвае будаўніцтва двухпавярховага корпуса для кацельнага аддзялення, пашырэнне механічнага цэха, устаноўку паравой машыны. Зараз заканчваюцца жалезабетонныя работы, выведзен другі паверх корпуса, закладзены фундаменты пад лесарамы і паравую машыну. Пашыраецца і пераабсталёўваецца механічны цэх. Лесарамы ўстанаўліваюцца ў шахматным парадку. Гэта пазбавіць ад лішняй затраты часу на падачу сыравіны ад адной лесарамы да другой. Пры такой устаноўцы лесарам на кожную змену скарачаецца 10 рабочых, што дае вялікую эканомію.

На заводзе арганізоўваецца папярэдняя адбракоўка пры пярвічнай апрацоўцы сыравіны. Такая арганізацыя вытворчага працэса значна палепшыць якасць выпускаемай прадукцыі, цалкам знішчыць брак.

Раней драўляныя апілкі ад лесарам адвазілі на тачках. Затрачвалі на гэта многа часу. Пасля рэканструкцыі ўсе адыходы ад сыравіны праз бункеры будуць паступаць у спецыяльна адведзеныя месцы.

Пераабсталёўваецца і кацельнае аддзяленне. Пры заводзе адкрываецца мэблевы цэх. Ужо вядзецца падрыхтоўка да ўстаноўкі станкоў па механічнай апрацоўцы піламатэрыялаў. Закончана будаўніцтва сушылкі, будуюцца склады гатовай прадукцыі, пракладваецца вузкакалейка.

На рэканструкцыю завода будзе выдаткавана каля 40 тысяч рублёў. Прадукцыйнасць завода ўзрасце на 35 процантаў.

В. Цярэшчанка.

УКЛЮЧЫЛІСЯ Ў ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЕ СПАБОРНІЦТВА

Парэцкая машынна-трактарная станцыя выканала гадавы план трактарных работ у пераводзе на мяккае ворыва на 100,4 процанта. План малацьбы выканан на 100,7 процанта.

Лепшыя трактарысты паказваюць узоры работы на палях. Трактарыст М. Глушакоў на трактары «Універсал-2» апрацаваў 182 гектары. Ён не меў ні адной аварыі. Толькі за жнівень месяц тав. Глушакоў зарабіў 1.300 рублёў грашыма і 1.300 кілограмаў хлеба. Трактарыст І. Мімош на трактары «Універсал-2» за жнівень і верасень апрацаваў 123 гектары.

Абмеркаваўшы пастанову Цэнтральнага камітэта КП(б)Б і Соўнаркома БССР аб ворыве зябліва, трактарысты і брыгадзіры машынна-трактарнай станцыі ўключыліся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва. Яны ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы па датэрміноваму выкананню плана ворыва зябліва.

Сідарчук,
намеснік дырэктара па палітчасці Парэцкай МТС.

НЯСТОМНА ЗМАГАЦЦА ЗА ВЫСОКУЮ ЯКАСЦЬ ПРАДУКЦЫІ

У рабоце тэкстыльнай прамысловасці верасень быў найбольш напружаным па выкананню квартальнай праграмы. Калі 12 аддзелачных фабрык і камбінатаў у ліпені здалі 693 тысячы 800 метраў сукна, або 70 процантаў плана, і ў жніўні — 1.104.800 метраў, або 84,8 процанта плана, то ў верасні было дадзена 1.373 тысячы метраў тканіны, што складае 113,9 процанта да плана. Пры квартальным плане ў 3,5 мільёна метраў здадзена на выхадную базу 3.170,7 тысячы метраў, што складае 90,5 проц. Лепш усіх працаваў 2-гі камбінат. Ён выканаў квартальны план на 120,2 процанта.

Не гледзячы на рад цяжкасцей пры рэарганізацыі камбіната, калектыў 5-га камбіната выдатна справіўся з сваім верасёўскім заданнем. План выканан на 143,7 процанта. Шосты камбінат за гэты месяц набраў тэмпы і квартальны план ім выканан на 115,9 процанта. Выканаў квартальны план на 102,1 процанта 8-ы камбінат. Астатнія камбінаты праграму трэцяга квартала не выканалі.

Аналізуючы прычыну невыканання плана трэцяга квартала, перш за ўсё трэба паглядзець на ліпень месяц, у якім план быў выканан на 70 процантаў. Прычыны гэтыя крыюцца ў тым, што многія кіраўнікі тэкстыльных прадпрыемстваў, баючыся адказнасці за выпуск нядобраякаснай прадукцыі, значную яе колькасць прытрымалі. Аб гэтым сведчыць той факт, што толькі ў кастрычніку было здана 693.800 метраў тканіны. І атрымалася, што многія швейныя фабрыкі Совецкага Саюза давалі неаднаразовыя тэлеграмы, якія напаміналі аб перабоі з атрыманнем тканін. Тэкстыльны трэст своечасова пастараўся вызваліцца ад гора-гаспадарнікаў, і камбінаты, навёрстваючы ўпушчанае, значна падцягнуліся ў верасні.

Адначасова з выкананнем плана не знімалася пытанне барацьбы за высокую якасць прадукцыі.

У ліпені выхадная база, рэалізуючы Ўказ ад 10 ліпеня 1940 года, павяла рашучую барацьбу з тымі, якія выпускаюць нядобраякасную прадукцыю. І як вынік, было звернута на прадпрыемствы 17.584 метры нядобраякаснай тканіны. У жніўні камбінаты некалькі палепшылі сваю работу і тады было звернута 4.419 метраў, з якіх 2.907 метраў належалі 7-му камбінату. У верасні работа некаторых камбінатаў зноў пагоршылася.

Горш па якасці працавалі трэці, сёмы і восьмы камбінаты. З гэтых камбінатаў паступала прадукцыя з палоснасцю. Нярэдка прадпрыемствы прысылаюць тканіны, на якіх паказана, што яны першага сорту. Аднак, пры разбракоўцы тавару па інструкцыі аказваецца, што ён нясортны. У першую чаргу гэта адносіцца да восьмага камбіната. І гэта не дзіўна. Калі наведаць трэці і восьмы камбінаты, няцяжка ўпэўніцца, што там вельмі мала ўвагі ўдзяляецца ролі бракоўшчыка. Прымітыўныя беракаткі, на якіх праглядаецца тканіна, знаходзяцца ў цесным памяшканні. Маленькія вокны ў гэтых памяшканнях не забяспечваюць дастатковага святла для правільнай разбракоўкі і вызначэння сортнасці. Бракоўшчыкі дрэнна ведаюць інструкцыю па разбракоўцы тканіны.

Побач з адмоўнымі момантамі ў якасці выпускаемай прадукцыі ёсць і прыклады станоўчыя. Так за ўвесь верасень на 1-м камбінаце з першага і другога сорту пераведзена ў трэція сарты 596 метраў тканіны, на 2-м камбінаце — 898 метраў, на 4-м камбінаце — 567 метраў, на 5-м камбінаце — 247 метраў і на 9-м камбінаце — 104 метры. З гэтых даных відаць, што ўпамянутыя камбінаты дабіліся нядрэнных рэзультатаў і не мелі ні аднаго выпадку звароту прадукцыі з базы.

Па адных толькі актах выхадной базы сума штрафу за трэці квартал дасягае 756.318 рублёў. З гэтай сумы 7-мы камбінат аштрафаван на 185.049 рублёў, 8-мы камбінат — 92.227 рублёў і 10-ы камбінат — 107.538 рублёў.

Праведзеная на базе нарада па раскладу малюнкаў і расфарбовак на апошні квартал зацвердзіла добрыя па якасці і аддзелцы, прыгожыя па малюнку і расфарбоўцы тканіны, якія павінны выпускаць прадпрыемствы тэкстыльнага трэста.

Гэта абавязвае кіраўнікоў мабілізаваць увесь калектыў рабочых і служачых фабрык і камбінатаў шырэй разгарнуць барацьбу за чэсць маркі беластоцкіх тканін і за выкананне квартальнага і гадавога плана.

В. Нахімоўскі,
начальнік аддзела якасці Беластоцкай выхадной базы «Галоўтэкстыльзбыт».

За выпуск бракованай прадукцыі — пад суд

ПАРЭЧЧА. **(Ад нашага карэспандэнта).** У жніўні друскеніцкая кравецкая арцель імені Чырвонай Арміі ад беластоцкага райспажыўсаюза атрымала матэрыял і заказ на 102 пары штаноў. Атрымаўшы вырабы, кліентура іх забракавала і адправіла назад. Старшыня арцелі Д. Мацэйскі быў абураны такім фактам. Да гэтага часу ён рабіў як хацеў і ўсё зыходзіла беспакарана. Ён запэўніваў, што штаны пашыты па стандарту, адпавядаючаму ўсім запатрабаванням.

Справа аб бракаробах была перадана следчаму Парэцкага раёна. Экспертнай камісіяй і следчымі органамі ўстаноўлена, што штаны зроблены нядобраякасна і груба, без бартовак, рост іх не адпавядае маркіроўцы. Устаноўлена, што старшыня арцелі Мацэйскі ведаў пра гэтыя недахопы, але ўпорна не жадаў іх выправіць.

Следства па гэтай справе закончана. На падставе Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 ліпеня бракаробы аддаюцца суду.

Г. Лупсякоў.

ВЫНІКІ СПАБОРНІЦТВА ДВУХ МТС

У адзін з летніх дзён на сядзібу Гродненскай машынна - трактарнай станцыі прыбыла грузавая аўтамашына. Прыехаўшыя адрэкамендаваліся, што яны з'яўляюцца прадстаўнікамі калектыва Граеўскай машынна-трактарнай станцыі і прыехалі заключыць соцыялістычны дагавор. Граеўцы і гродненцы падпісалі дагавор. Былі абаюдна ўзяты абавязацельствы: перавыканаць гадавы план трактарных работ і заваяваць пяршынства ў вобласці.

У трактарных брыгадах шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва. Рос лік вадзіцеляў машын, сістэматычна перавыконваючых нормы выпрацоўкі.

Зараз ужо можна падвесці некаторыя вынікі спаборніцтва. Гэтыя вынікі гавораць аб тым, што работнікі Граеўскай МТС з чэсцю выконваюць ўзятыя на сябе абавязацельствы. Гадавы план трактарных работ перавыканан: пры плане ў 1.665 гектараў узарана 1.690 гектараў. Поўнасцю выканан план ворыва зябліва.

Лепшай сярод трактарных брыгад з'яўляецца брыгада, якой кіруе тав. Лупкінаў. Выканаўшы свой гадавы план, трактарысты паспяхова працуюць на ворыве зябліва. Стаханавец-трактарыст тав. Барысаў ужо ўзараў 300 гектараў. У МТС 11 вадзіцеляў машын сістэматычна перавыконваюць дзённыя нормы выпрацоўкі.

Самым знамянальным вынікам з'яўляецца рост кадраў. Тут падрыхтавана 10 новых трактарыстаў. Учарашнія прычэпшчыкі сёння добра працуюць трактарыстамі. Гэтай складанай кваліфікацыяй яны авалодалі без адрыву ад вытворчасці. Яны паказваюць высокую прадукцыйнасць працы. Узяць хаця-б Сцяпана Барыла і Станіслава Копец. З вясны яны сталі працаваць прычэпшчыкамі. Прыкладаючы многа працы і стараннаў, яны ўпорна вучыліся кіраваць машынай. Зараз яны — трактарысты і штодзённа перавыконваюць нормы выпрацоўкі. Уважлівы догляд за трактарам, чэсныя адносіны да працы далі ім магчымасць стаць перадавымі трактарыстамі.

У кабінеце дырэктара МТС тав. Чысцякова можна часта бачыць сялян-аднаасобнікаў, якія просяць узараць ім участкі. Просьбы сялян заўсёды выконваюцца акуратна. МТС заваявала заслужаную славу і аўтарытэт сярод калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў.

Разам з ростам тэхнічнага аснашчэння паляпшаюцца і культурна-бытавыя ўмовы рабочых і служачых МТС. Мяняецца аблічча цэнтральнай сядзібы, заканчваецца будаўніцтва жыллёвага дома, машынна-трактарнай майстэрні, навеса для сельскагаспадарчых машын. Да зімы будзе абсталяван чырвоны куток, для якога набываецца бібліятэка.

У сувязі з наблiжэннем слаўнай XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі сярод калектыва МТС наглядаецца вялікі ўздым. Рабочыя рыхтуюць дастойную сустрэчу ўсенароднаму святу. Не супакойваючыся на дасягнутым, яны хочуць прыйсці да свята з поўным заканчэннем зябленага ворыва і малацьбы ў калгасах.

В. Гродненскі.

Жывёлагадоўля—крыніца даходаў

Калгаснікі Граеўскага раёна з першых-жа дзён калектыўнай працы ўзяліся за стварэнне жывёлагадоўчых ферм. У калгасах імені 17 верасня, імені Першага мая і імені Сталіна арганізавана па дзве фермы: малочна-таварныя і свінагадоўчыя.

З моманту арганізацыі жывёлагадоўчых ферм прайшло нямнога часу. Аднак ужо можна падвесці некаторыя вынікі іх работы. Вынікі гэтыя гавораць аб тым, што жывёлагадоўля нават у першы год існавання фермы дае вялікія даходы.

Малочна-таварная ферма калгаса імені 17 верасня мае 28 дойных кароў. За праданае малако калгас атрымаў каля 8 тысяч рублёў даходу. На свінагадоўчай ферме налічваецца 38 галоў.

У калгасе выраслі выдатныя кадры жывёлаводаў. Некаторыя даяркі і даглядчыцы свіней і цялят паказваюць узоры работы. Яны любоўна даглядаюць жывёлу. Даглядчыца цялят Шыракоўская выгадавала і захавала поўнасцю маладняк. Усе цяляты, якіх яна даглядае, маюць добрую ўкормленасць.

Даярка калгаса імені Першага мая Томчык добрасумленна адносіцца да сваёй работы. Раней на ферме працавалі дзве даяркі, зараз тав. Томчык спраўляецца з работай адна. Яна заўсёды своечасова даглядае і доіць кароў.

К. Палітава,
зоатэхнік Граеўскага райза.

НАРАДА АДКАЗНЫХ ВЯСКОВЫХ РАБОТНІКАЎ

Днямі Чыжаўскі райком партыі і райвыканкома склікалі нараду старшынь, сакратароў і членаў сельсоветаў, упаўнаважаных вёсак і старшынь калгасаў. Прапагандыст райкома тав. Старавойтаў прачытаў даклад на тэму: «Вучэнне Леніна — Сталіна аб нацыянальным пытанні». У спрэчках па дакладу выступіла 7 чалавек.

Затым нарада заслухала старшынь сельсоветаў аб выкананні гаспадарчых і палітычных задач, у прыватнасці бульбапаставак, падняцця зябліва і т. д.

На нарадзе прысутнічала каля 200 чалавек.

М. Сідарэнка,
інструктар райкома партыі.

Закрылася Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка

15 кастрычніка ў Маскве закрылася Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка 1940 года. У 2 гадзіны дня на плошчы Калгасаў адбыўся мітынг, на якім прысутнічалі прадстаўнікі маскоўскіх арганізацый, экспаненты, экскурсанты, усе наведвальнікі выстаўкі.

Увечары ў Цэнтральным клубе НКВД СССР для калгаснікаў, удзельнікаў і экскурсантаў выстаўкі быў наладжан канцэрт ансамбля песні і пляскі НКВД СССР.

Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка 1940 года працавала роўна 5 месяцаў. За гэты час яе наведала 4,5 мільёна чалавек.

З розных куткоў краіны на выстаўку прыязджалі сотні тысяч людзей калгаснай вёскі. Адных толькі старшынь калгасаў пабывала 16,1 тыс. чалавек, трактарыстаў — 13,2 тыс., камбайнераў — 2,5 тыс., аграномаў — 11,3 тыс., зоатэхнікаў— 6 тыс., жывёлаводаў — 40,1 тыс. і т. д.

Свае дасягненні дэманстравалі на выстаўцы 40.572 гаспадаркі і 286.994 перадавікі. Усяго экспанентаў было 327.600 тыс. — на 130,9 тыс. больш, чым у мінулым годзе.

На выстаўцы 1940 года ўдзельнічалі: 5 краёў і абласцей, 5 аўтаномных абласцей і нацыянальных акруг, 252 раёны, 348 МТС, 951 соўгас, 19.730 калгасаў, 15.118 жывёлагадоўчых ферм і 479 навуковых устаноў.

На выстаўцы пабывала нямала сялян з заходніх абласцей Беларусі і Украіны. У кнігах водгукаў яны выказваюць сваё захапленне бачаным.

У апошнія месяцы выставачны гарадок наведалі дэлегацыі Бесарабіі, Паўночнай Букавіны і новых савецкіх рэспублік Прыбалтыкі.



На здымку: экскурсанты ад Крынкаўскага раёна Беластоцкай вобласці на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў павільёне «Механізацыя» аглядаюць сельскагаспадарчыя машыны, якімі ўзброены калгасы СССР. Фота А. Сапіра.

Развіваць калгасную жывёлагадоўлю

Многа ўвагі ўдзяляе развіццю грамадскай жывёлагадоўлі калгас імені Сталіна, Бельскага раёна. За поўгода існавання калгаса тут арганізавана тры жывёлагадоўчых фермы.

Ферма буйнай рагатай жывёлы налічвае 56 галоў, у тым ліку 29 дойных кароў, прычым дойных кароў на 9 галоў больш, чым гэта па плану прадугледжана. На зімовы перыяд нагатоўлена дастатковая колькасць канцэнтрыраваных і сакавітых кармоў.

Горш абстаіць справа з памяшканнем для жывёлы. У калгасе быў стары скотны двор, і жывёла магла тут зімаваць. Але памяшканне разбурыла бура. Калгаснікі вымушаны у сувязі з гэтым спешным парадкам будаваць новы кароўнік.

Паспяхова расце свіное пагалоўе калгаса. У красавіку было толькі 7 свіней, цяпер —34. Ад чатырох свінаматак палепшанай пароды поўнасцю захаван увесь прыплод. Калгасны свінар Браніслаў Ключынскі вельмі старанна і любоўна вырашчвае парасят. Да канца года свінатаварная ферма будзе мець 13 свінаматак палепшанай пароды, замест 10 па плану. Свінарнік абсталёўваецца да зімоўкі: робяцца станкі, ацяпляецца памяшканне. Кармоў будзе ў дастатковай колькасці.

У калгасе ёсць 36 авечак. Але ў адпаведнасці з колькасцю зямлі ўжо ў гэтым годзе павінна быць 80 авечак. Аўцатаварная ферма будзе расці за лік свайго прыплоду і закупак авечак. Для авечак яшчэ няма спецыяльнага аўчарніка, але яны будуць зімаваць у цёплым і прасторным памяшканні.

Аднак, раённы зямельны аддзел мала ўдзяляе ўвагі развіццю грамадскай жывёлагадоўлі. Неабходна арганізаваць закупку цялят у калгаснікаў для арганізацыі і папаўнення ферм буйнай рагатай жывёлы. Такім шляхам павінны арганізавацца і расці іншыя жывёлагадоўчыя фермы. Закупка павінна стаць важнейшай крыніцай росту і арганізацыі новых жывёлагадоўчых ферм.

Трэба зразумець, што калектыўную сельскую гаспадарку немагчыма падняць без развіцця грамадскай жывёлагадоўлі.

Г. Майсееў.

ФІТАФТОРА І ЯЕ ШКОДНАСЦЬ

Адным з самых шкодных захворванняў бульбы з'яўляецца фітафтора. Асаблівую шкоду яна прыносіць у дажджлівае лета. Перш за ўсё фітафтору можна заўважыць на ніжнім лісці каля зямлі. Адрозніваецца заражонае лісце ад незаражонага круглымі цямнымі плямамі, якія з цягам часу, пры спрыяючых умовах для развіцця грыбка, ахапляюць увесь ліст. У дажджлівае надвор'е на ніжнім баку пашкоджаных лісцяў можна заўважыць белавата-шэрага колеру налёт, які і з'яўляецца самым характэрным прызнакам фітафторы.

Заражэнне здаровага лісця можа быць у тым выпадку, калі на яго трапіць спора грыбка, якая пры спрыяльных умовах нарастае, расток пранікае ў ткань ліста ці іншага органа расліны, утварае там грыбніцу, і ліст пад уплывам гэтага адмірае. Зразумела, калі зялёнае лісце заўчасна адмірае, то значна зніжаецца ўраджай клубняў. Аднак шкоднасць фітафторы гэтым не абмяжоўваецца. Ад заражонага бульбоўніка заражаюцца і клубні, што можа адбывацца двума шляхамі. Па-першае, калі споры грыбка з бульбоўніка пранікаюць да клубня з дапамогай дажджавой вільгаці; гэта тады, калі клубні размешчаны блізка да паверхнасці глебы ў часе росту ў полі; па-другое пры дакрананні здаровых клубняў да заражонага бульбоўніка ў часе уборкі.

Заражоныя тым або іншым шляхам клубні хутка гніюць у часе захоўвання. На клубнях захворванне праяўляецца ў выглядзе шэрых уціснутых плям, а пры разрэзе клубня можна бачыць іржавыя плямы, размешчаныя на перыферыі клубня.

Высаджаныя на наступны год заражоныя клубні даюць хворыя расліны і, акрамя таго, з'яўляюцца ачагамі распаўсюджвання фітафторы па ўсяму полю.

Атрымліваць высокія і ўстойлівыя ўраджаі бульбы можна толькі пры ўмове правядзення агратэхнічных мерапрыемстваў. Важнейшымі з іх з'яўляюцца наступныя: пасадка выключна здаровых клубняў; своечасовае і добраякаснае акучванне бульбы; скошванне заражонага бульбоўніка, але не раней як за 5—10 дзён да ўборкі, у залежнасці ад ступені заражэння і надвор'я; правільны севазварот і падбор устойлівых сартоў. Акрамя таго з фітафторай неабходна прымяняць хімічныя меры барацьбы.

С. Е. Пучкова,
аграном гродненскага назіральнага пункта.

Будаўніцтва ў Граеўскім раёне

Прайшоў год з таго часу, як, выконваючы вялікую гістарычную місію, Чырвоная Армія вызваліла працоўных заходніх абласцей ад прыгнёту польскіх паноў. Перад працоўнымі заходніх абласцей стала задача аднаўлення разбуранай польска-германскай вайной гаспадаркі. Рабочыя і працоўнае сялянства зразумелі, што справа аднаўлення народнай гаспадаркі, будаўніцтва новага жыцця з'яўляецца іх справай.

Працоўныя Граеўскага раёна разам з усімі працоўнымі заходніх абласцей Беларусі ўзяліся за будаўніцтва новага жыцця. Граеўскі раён з'яўляецца раёнам найбольш моцна пацярпеўшым ад польска-германскай вайны.

Некаторыя прамысловыя прадпрыемствы, якія былі на тэрыторыі Граеўскага раёна, бяздзейнічалі. Так, напрыклад, шклозавод не працаваў з 1930 года. Аказалася, што прычынай бяздзейнічання шклозавода з'явілася тое, што аб'яднанне прамыслоўцаў, якія займаліся шкляной вытворчасцю, выплачвала ўладальніку завода адпаведную суму грошай за тое, каб яго завод стаяў і ён не канкурыраваў з імі на рынку.

У Граеўскім раёне ёсць 16 прадпрыемстваў. Выпуск прадукцыі іх за год савецкай улады павялічыўся ў два разы. Былы польскі ўрад не клапаціўся аб дабрабыце працоўных. У раёне было мала школ і бальніц, але і гэтыя былі здабыткам толькі заможнай часткі насельніцтва. Зараз бюджэт на асвету па раёну на 1940 год складае 2 мільёны 126 тысяч 400 рублёў, на ахову здароўя 921 тысячу рублёў. На дарожнае будаўніцтва адпушчана 100 тысяч.

У раённым цэнтры заканчваецца будаўніцтва дома соцыялістычнай культуры на 650 месц. У ім будзе абсталявана гукавое кіно, чытальня і бібліятэка. У раёне пабудавана няпоўная сярэдняя школа на 255 чалавек, будуецца дзіцячы дом на 50 чалавек. Зараз у раёне ёсць дзве сярэднія школы, 11 няпоўных сярэдніх і 42 пачатковых школы. Капіталаўкладанні па прамысловасці і жыллёваму фонду на 1940 год складаюць 1.661.100 рублёў. На гэтыя сродкі будуюцца: ветэрынарная лячэбніца, дом соцкультуры, дзіцячы дом, гасцініца, склад «Заготзярно», паліклініка, адбудоўваюцца разбураныя вайной дамы і т. д.

Яшчэ большы размах будаўніцтва намячаецца ў будучым годзе. Па жыллёваму фонду намячаецца адбудаваць чатыры каменныя дамы на 36 кватэр, пабудаваць раённую бальніцу, лазню. Намячаецца таксама пабудаваць вадаправод і каналізацыю. Будзе пераабсталявана электрастанцыя.

Раён багат залежамі торфу. Таму ў 1941 годзе намячаецца пашырэнне здабычы торфу, для чаго будзе пабудаван торфзавод.

Выконваючы рашэнні партыі і ўрада аб усямерным пашырэнні мясцовай прамысловасці, намечана пабудаваць завод па вырабу штучнага мрамару з адыходаў лесапільных прадпрыемстваў, цагельны завод, абсталяваць чарапічны завод і арганізаваць рад майстэрань.

В. Цяста,
планавік-эканаміст Граеўскага райвыканкома.

Больш увагі комунальнай гаспадарцы

Кіраўнікі Саколкаўскага райвыканкома і горсовета не супроць заявіць, што гарадская гаспадарка ў поўным парадку. Аднак, калі ўнікнуць у становішча спраў,—сапраўднасць пакажа адваротнае.

Комунальны аддзел рашыў адрамантаваць гарадскую лазню, але яна і да гэтага часу не адрамантавана, і няма дзе памыцца. Горсовет не праяўляе клопатаў і аб забеспячэнні насельніцтва палівам.

Нездавальняюча абстаіць справа з прывядзеннем у парадак дарог. Адзіная дарога, якая вядзе да станцыі, знаходзіцца ў запушчаным становішчы. Аб рамонце яе ніхто не думае.

Горсовет рашыў сканцэнтраваць гандаль на рынку ў адным месцы. Пачынанне добрае. Дрэнна толькі тое, што гэта справа не даведзена да канца.

Г. В.

Філіп ПЕСТРАК

НАД МОРАМ

Хвалі гуллівыя...
У дзень прамяністы
Бурунамі з далі бяздоннай
плывуць,
Іх сівыя грывы
Аб бераг крамністы
Б'юцца, клякочуць і пеніста
рвуць.

Дзень у прасторы
Зрывае з лазуры
Ветра ласкавы, прывольны парыў,
І песцяцца ў моры
Сваволныя буры
З ранку да ціхай вячэрняй зары.

Сяджу у задуме
Загледжаны ў далі,
Утомлен, знямелы, застыўшы
душой, —
О, мора! У шуме
Тваім мне дрыжалі
Не раз твае песні і клікалі
ў бой

Па хвалях шумлівых
Сную ў безбярэжжы,—
Сную па дарогах мінулых
жыцця —
І з песняй шчаслівай
На родныя межы,
Мне хочацца выйсці на смелы
прасцяг.

Даплыў я да прыстані,
Ціхай, заветнай,
Па хвалях тваіх, несканчона
гулкіх
І грудзі вось выставіў
Сіняму ветру
З ранамі дзён пад'ярэмна-
глухіх.

Хай вее ў лазуры
Агніста, прывольна
Майго неспакойнага сэрца
палёт —
Дзень мой пануры
Ужо стаўся свабодным,
І моладасць я пачынаю здалёк.

Усёўладнае мора!
Мне вешчыя знакі
Піша на сэрцы стыхія твая —
Я чую, што скора
Увесь новы свой накіп
Я ворагу пырсну у твар.

Одэса.
4 чэрвеня 1940 г.

Настаўнік — вялікая культурная сіла

У Ломжынскім раёне і горадзе — 49 польскіх школ, з іх 2 сярэдніх. У школах працуюць 333 настаўнікі. Гэта значная культурная сіла, якая здольна правесці велізарную палітычна-масавую работу сярод насельніцтва, калі яе правільна напраўляць і выкарыстоўваць.

У час выбарчай кампаніі па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР настаўнікі прымалі самы актыўны ўдзел у якасці агітатараў, членаў выбарчых камісій і т. д. Дастаткова сказаць, што ў якасці агітатараў працавала 140 настаўнікаў.

Многія з настаўнікаў не спынілі сваёй работы на былых выбарчых участках і цяпер працягваюць яе з вялікім поспехам. Завуч 3-й школы тав. Сабалеўскі сістэматычна гутарыць на розныя тэмы з жыхарамі дома № 5 па вуліцы Чэрнышэўскага. Настаўнік тав. Смаленскі праводзіць гутаркі з жыхарамі дамоў № 20 — 22 на Старым Рынку. Настаўніца школы № 6 тав. Суражская вядзе агітацыйную работу ў дамах № 4—6 па вуліцы Чэрнышэўскага і т. д.

Многія настаўнікі сельскіх школ таксама праводзяць вялікую грамадскую работу ў сельсоветах. Настаўнікі Мацейкоўскі і Гембажэўскі (Драздоўскі сельсовет) прывялі ў парадак бібліятэку, даюць сістэматычную кансультацыю па розных пытаннях пры бібліятэцы, дапамагаюць сельсовету ў выкананні палітычна-гаспадарчых мерапрыемстваў.

Настаўнік Тарноўскай школы тав. Далінны праводзіць культурную работу ў калгасе імені Дзержынскага. Ён робіць даклады, дапамагае рэдкалегіі насценнай газеты.

Асабліва каштоўная ініцыятыва школьнага калектыва гарадской школы № 3 (дырэктар кандыдат партыі тав. Семашка). Настаўнікі і вучні гэтай школы па выхадных днях выязджаюць у калгас імені Дзержынскага, у сельсоветы з дакладамі і паказам мастацкай самадзейнасці. Актывісты - настаўнікі тт. Сабалеўскі, Трачэўскі, Ясінская, Вайтовіч, Ольбрэхтовіч і іншыя з'яўляюцца застрэльшчыкамі масава-культурных мерапрыемстваў.

Хор, у якім 84 вучні, танцавальны калектыў гэтай школы неаднаразова абслугоўвалі прызыўны пункт, выступалі на былых выбарчых участках і ўсюды карысталіся заслужаным поспехам.

Настаўнікі польскіх школ цягнуцца да палітычных ведаў. Яны наведваюць лекцыі, кансультацыі пры парткабінеце. Многія з іх самастойна вывучаюць гісторыю партыі. Гурткамі па вывучэнню гісторыі партыі ахвачана 50 настаўнікаў.

Аднак у рабоце сярод настаўнікаў многа недахопаў. Тут перш за ўсё трэба сказаць аб выпадках няправільнай расстаноўкі кадраў. Дырэктарам першай сярэдняй польскай школы восем месяцаў быў нехта Хоцька, які не ведаў ні слова па-польску, ён поўнасцю сябе скампраметыраваў і быў зняты з работы. Пасля яго выконваючым абавязкі дырэктара была назначана тав. Аўдзеева, а завучам тав. Бутурлаў, якія таксама не ведаюць польскай мовы. У выніку ў школе не адчуваецца правільнага кіраўніцтва.

Аналагічны прыклад можна прывесці з школы ў вёсцы Ломжыца, дзе дырэктар тав. Каралькова і завуч тав. Францус, не ведаючы польскай мовы, не могуць згуртаваць школьны калектыў.

Гэтыя факты гавораць аб перастрахоўцы кіраўнікоў гарана тав. Ісіцкага і райана тав. Мураўёва, аб іх баязні вылучыць з асяроддзя польскіх настаўнікаў кандыдатаў на кіруючыя пасты ў школе.

Гэта недаацэнка работы сярод настаўнікаў характэрна і для пярвічнай партарганізацыі гарана (сакратар тав. Перапеліцына). За ўвесь час існавання партарганізацыі (пяць месяцаў) толькі адзін раз — 7 кастрычніка быў праведзен агульны адкрыты сход партарганізацыі. Але і тут не абышлося без казуса — аб'явы аб сходзе не вывешалі, у выніку на сход прышлі толькі дырэктары і завучы школ, якія атрымалі павесткі, а настаўнікі аб сходзе не ведалі.

Ёсць і іншыя прычыны, якія тармозяць уцягненне настаўнікаў у масавую работу. Па прапанове аддзела прапаганды і агітацыі райкома партыі тав. Ясінская — настаўніца 3-й школы падрыхтавала даклад аб творчасці М. Горкага. Гэты даклад ёй даручылі зрабіць у аддзяленні дзяржбанка. Тав. Ясінская двойчы хадзіла туды, але ні разу служачыя банка не сабраліся.

З другога боку неабходна адзначыць, што веды настаўнікаў не выкарыстоўваюцца ў поўнай меры. Настаўнік фізікі і матэматыкі 3-й школы тав. Каліноўскі неаднаразова прапаноўваў прачытаць папулярную лекцыю па астраноміі, а настаўнік першай школы тав. Гаскевіч — па геалогіі. Але ім чамусьці не далі прачытаць лекцыі.

Настаўнікі школ — велізарная палітычная і культурная сіла ў горадзе і раёне. З іх дапамогай праведзена значная агітацыйна-масавая і культурная работа сярод насельніцтва. Гэтая работа будзе яшчэ больш значнай, калі будзе пераможана недаацэнка ролі настаўніка.

Е. Крэстнікаў.



На ўроку хіміі ў 10 класе 12-й беластоцкай польскай школы. Урок вядзе настаўніца Е. І. Лампарская. Фота А. Сапіра.

Паведамленне ТАСС

Дацкая газета «Палітыкен» распаўсюджвае паведамленне свайго карэспандэнта з Берліна, у якім гаворыцца, што «Савецкі ўрад у належны час быў інфарміраван аб тым, што германскія войскі будуць пасланы ў Румынію, што Крэмль быў інфарміраван аб мэтах і размерах войск, якія былі пасланы ў Румынію».

ТАСС упаўнаважан заявіць, што гэтае паведамленне «Палітыкен» не адпавядае сапраўднасці.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

БЕРЛІН, 16 кастрычніка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне паведамляе:

Учора англійскія самалёты зноў скінулі бомбы на жылыя дамы і сялянскія двары Сярэдняй і Заходняй Германіі. Сярод грамадзянскага насельніцтва ёсць забітыя і раненыя.

Атакі германскай авіяцыі былі накіраваны супроць важных ваенных аб'ектаў Паўднёвай і Сярэдняй Англіі і, у першую чаргу, супроць самога Лондана. Скінута многа бомб цяжкага калібра на ваенныя заводы, транспартныя збудаванні, базы снабжэння, а таксама партовыя збудаванні. Моцныя пажары па абодвух баках затібу Тэмзы і ў раёне докаў Вікторыя былі відавочны з узбярэжжа Ла-Манша.

Учора непрыяцель страціў у баях 38 знішчальнікаў, германская авіяцыя—7.

Дзве германскія падводныя лодкі патапілі 6 узброеных непрыяцельскіх гандлёвых суднаў агульным танажам у 36.800 рэгістравых брута-тон.

БЕРЛІН, 16 кастрычніка. (ТАСС). Інфармацыйнае бюро перадае: «У сувязі з тым, што англічане ўсё яшчэ не адмовіліся ад бамбардыроўкі германскага грамадзянскага насельніцтва і неваенных аб'ектаў, германская авіяцыя 15 і ў ноч на 16 кастрычніка ўвяла ў дзеянне ў час налётаў на ваенныя і важныя ў ваенных адносінах аб'екты Лондана больш буйныя сілы, якія прычынілі велізарныя страты гораду».

Адначасова паведамляецца, што ў ноч на 16 кастрычніка ў атацы на Лондан удзельнічала каля тысячы германскіх самалётаў, скінуўшых больш 1 тысячы тон бомб. У Лондане—хаос. Узнікла многа пажараў. Снабжэнне горада надоўга паралізавана. Амаль усе германскія самалёты звярнуліся на базы.

АНГЛІЙСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

ЛОНДАН, 16 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае міністэрства авіяцыі, асобным германскім самалётам, удзельнічаючым ва ўчарашнім налёце на Англію, удалося бамбардыраваць паўднёвую і ўсходнюю часткі Лондана. Аднак прычыненыя страты і колькасць афяр невялікія. У другіх раёнах Англіі пашкоджанні таксама нязначныя. Уночы самалёты праціўніка з'яўляліся над Англіяй невялікімі групамі амаль праз кожныя 4 мінуты, але ўсякі раз адганяліся агнём зенітных батарэй. Па апошніх звестках, учора было збіта 18 германскіх самалётаў. Англійская авіяцыя страціла 15. Дзевяць лётчыкаў з экіпажаў гэтых самалётаў выратаваліся.

У Германіі ў ноч на 15 кастрычніка адным з галоўных аб'ектаў бамбардыроўкі з'явіўся завод сінтэтычнага бензіну ў Пеліце (паблізу Штэціна), магутнасць якога звыш мільёна тон бензіну ў год. Значна пашкоджаны заводскія корпусы. Бамбардыроўцы падпалі таксама нафтаперагонныя заводы ў Белене і Магдэбургу. Абодва яны даюць вялікую колькасць сінтэтычнага і авіяцыйнага бензіну. Іншыя злучэнні англійскай авіяцыі атакавалі докі ў Эмдэне і Гамбургу, чыгуначныя шляхі ў Гановеры і Лінгене. Усюды адзначаны пажары і ўзрывы. Паспяховай бамбардыроўцы падпалі таксама партовыя збудаванні у Альтгаарце, на ўзбярэжжы Балтыйскага мора і ў радзе іншых раёнаў.

ЛОНДАН, 16 кастрычніка. (ТАСС). Па паведамленнях газет, у час налёту, у ноч на 16 кастрычніка, германскія самалёты скінулі на Лондан велізарную колькасць новых бомб усіх тыпаў. Учора раніцай бамбардыроўцы падпалі 70 раёнаў Лондана.

АМЕРЫКАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

НЬЮ-ЙОРК, 16 кастрычніка. (ТАСС). Па паведамленню «Нью-Йорк геральд трыбюн», скінутыя ў час учарашніх налётаў на Лондан запальваючыя бомбы выклікалі многалікія пажары, якія былі, аднак, хутка лакалізаваны. Бамбардыроўкай пашкоджаны газавыя трубы і водаправод.

Дзённы налёт пачаўся трыма паслядоўнымі хвалямі з інтэрвалам у 5 мінут. Непрыяцельскія самалёты ляцелі на вышыні 10 тысяч футаў. У Лондане і яго прадмесцях разбураны завод, два кінотэатры, некалькі будынкаў.

Як перадае лонданскі карэспандэнт газеты «Нью-Йорк пост», апошнімі бамбардыроўкамі Лондана разбураны буйнейшыя грамадскія будынкі і жылыя дамы. У адным раёне горада карэспандэнт, праходзячыся на некалькіх вуліцах, заўважыў, што амаль ва ўсіх дамах былі выбіты шыбы, дахі пацярпелі ад пажараў. Многія будынкі поўразбураны. Самае лепшае сховішча, якім ганарыліся мясцовыя ўлады, развалілася пад ударамі бомб, якія падалі ў 500 метрах ад сховішча.

Па словах агенцтва Юнайтэд Прэс, ні зенітная артылерыя, ні аэрастаты паветранай загароды не ў сілах былі загарадзіць шлях германскім самалётам.

Неўзабаве пасля паўночы непрыяцельскія самалёты паміма Лондана зрабілі налёт на 25 правінцыяльных раёнаў Цэнтральнай і Паўднёва-Заходняй Англіі.

Ад'езд англічан з Румыніі

БУХАРЭСТ, 15 кастрычніка. (ТАСС). Большасць англійскіх падданых пакінула ўжо Румынію. Пашпарты ўсіх дыпламатычных работнікаў завізіраваны. Частка англійскіх журналістаў ужо выехала. Днямі выязджаюць у Балгарыю карэспандэнты агенцтва Рэйтэр і газеты «Таймс».

ЛОНДАН, 15 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, намеснік міністра замежных спраў Батлер заявіў у палаце абшчын, што значная колькасць англійскіх падданых і частка членаў англійскай місіі ў Бухарэсце пакінулі ўжо Румынію.

СТАНОВІШЧА НА МАЛЬЦЕ

БЕРЛІН, 16 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Трансоцэан перадае, што з моманту ўступлення Італіі ў вайну на Мальту было зроблена 150 паветраных налётаў, у выніку якіх налічваецца 200 забітых і 400 раненых.

700 чалавек асталіся без прытулку і вымушаны жыць у пячорах, зробленых у скалах. Насельніцтва вострава прадбачыць магчымасць італьянскага ўварвання. На вуліцах гарадоў збудаваны дротавыя загарожы і іншыя перашкоды. Англійскія ўлады сфарміравалі спецыяльныя часці для барацьбы з парашутыстамі.

—о—

Рэгістрацыя ваеннаабавязаных у ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 16 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе друк, сёння на аснове закона аб воінскай павіннасці пачата рэгістрацыя звыш 16 мільёнаў мужчын ва ўзросце ад 21 да 36 год. У Нью-Йорку рэгістрацыі падлягаюць 1.100 тысяч чалавек. Пасля рэгістрацыі пытанне аб прызыве на ваенную службу рашыцца жараб'ёўкай. Мяркуюць, што ў бліжэйшы час будзе прызвана 400 тысяч чалавек. Закон аб воінскай павіннасці прадугледжвае максімальны прызыў на працягу года 900 тысяч чалавек.

—«о»—

Пратэст супроць няроўнасці неграў ў амерыканскай арміі

НЬЮ-ЙОРК, 15 кастрычніка. (ТАСС). «Нацыянальная асацыяцыя па абароне правоў неграў» выступіла з заявай, у якой пратэстуе супроць аб'яўленай урадам ЗША палітыкі, якая прадугледжвае захаванне раздзелу неграў і белых у радах узброеных сіл ЗША. Арганізацыя падвяргае сумненню заяву ўрада аб добрым маральным становішчы неграў у арміі. У заяве гаворыцца, што, наадварот, многія салдаты негрыцянскіх злучэнняў неаднаразова пратэставалі супроць таго, што іх ператвараюць у служак афіцэраў белай расы. Аддзяленне неграў ад белых у арміі, гаворыцца далей у заяве, згубна дзейнічае на маральнае становішча салдат белай расы і падтрымлівае ў іх расавыя забабоны супроць неграў.

Арганізацыя таксама паведамляе з Вашынгтона, што лідэр дэмакратаў у сенаце Берклі заявіў у сенаце 8 кастрычніка, што пры цяперашнім міжнародным становішчы і выкананні праграмы абароны недапушчальна і бескарысна дабівацца прыняцця закона супроць лінчавання.

Штогодна рэакцыйным сенатарам — дэмакратам ад Паўднёвых штатаў пры маўклівай згодзе іншых сенатараў удаецца сарваць абмеркаванне і прыняцце закона аб пакаранні за лінчаванне.


—0—

Гіганцкая ўстаноўка для расшчаплення атамнага ядра

У Каліфорнійскім універсітэце (ЗША) распрацоўваецца праект збудавання звышмагутнай устаноўкі для даследванняў у галіне атамнага ядра. Як мяркуюць, магутнасць гэтай устаноўкі складзе 100 мільёнаў вольт. Размеры магніта (цыклатрэна) для бамбардыроўкі атамнага ядра наступныя: даўжыня 17 метраў, шырыня 4,5 метра і вышыня 11 метраў.

Памяшканне для кіравання цыклатронам будзе для беспапаснасці абслугоўваючага персанала размешчана пад зямлёй на адлегласці 45 метраў ад устаноўкі.

(ТАСС).



Агульны ўнутраны выгляд беластоцкага цацачнага магазіна па Савецкай вуліцы. Фота А. Сапіра.

Тэатр казачнай рэчаіснасці

Майму сябру ўсяго 10 год. Імя яго Алёшка. Але ён адклікнецца, калі назавеце яго Ізюкам ці Іскрай. Гэта шматіменнасць асталася ў яго з часоў канспірацыі, бо Алёшка пачаў свой жыццёвы шлях у зняволенні: ён нарадзіўся ў пінскай турме.

Разам з ім мы бачылі спектаклі Дзяржаўнага тэатра юнага гледача БССР. Разам з ім мы перажылі надзвычайна хвалюючыя мінуты, калі на сцэне паказваўся працэс нараджэння чалавека, які сапраўды «гучыць горда».

На старонках літаратурнай прэсы ідзе дыскусія аб пазітыўным героі нашай эпохі. Мы з Алёшкам бачылі яго на сцэне тэатра юнага гледача. Мы яго бачылі ў вобразе пераможцы смерці, у таго, які знайшоў найвялікшы сэнс жыцця — у Паўла Карчагіна з п'есы «Як гартавалася сталь». Мы яго бачылі ў вернай упорнай дзяўчынцы з «Снежнай каралевы». Мы бачылі яго на рэпетыцыі цудоўнай драмы «На парозе жыцця» у вобразе Ільі.

У гэтым — вялікая заслуга таленавітага калектыва тэатра. Мы бачым, як сталь ачышчаецца ад шлаку, мы бачым цяжкасці станаўлення героя, таму нават казачнае ператвараецца ў поўнакроўную рэчаіснасць.

Спектаклі тэатра юнага гледача ўплываюць на нашых маладых сяброў пераконваючым мастацкім прыкладам. У гэтым яго велізарнае значэнне для выхавання чалавека, гатовага да гераічных паступкаў, сапраўднага грамадзяніна нашай сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Г. Смоляр.

МЕДЫЦЫНСКАЯ ДАПАМОГА САНІТАРНАЙ АВІЯЦЫЯЙ

Некалькі дзён таму назад у беластоцкі абласны аддзел аховы здароўя прыбыла тэлеграма: «Звяжыцеся з курсамі Наркамлеса ў Белавежы для аказання дапамогі хвораму Шчарбакову з боку кваліфікаванага спецыяліста».

Неадкладна ўрач-тэрапеўт тав. Магаліф вылецеў на самалёце да хворага і аказаў яму неабходную медыцынскую дапамогу.

У 2 гадзіны дня ў абласны аддзел аховы здароўя пазванілі з замбраўскай раённай амбулаторыі.

— Прысылайце санітарны самалёт за цяжка хворай жанчынай. Мяркуемы дыягназ: заварот кішок.

Праз некалькі мінут самалёт знаходзіўся ў паветры. Не прайшло і двух гадзін, як хворая была ў хірургічным аддзяленні 2-ой беластоцкай бальніцы, дзе яе агледзеў адзін з лепшых беластоцкіх хірургаў урач Федаровіч.

Днямі ў новаадкрытую снядаўскую бальніцу прывезлі з вёскі хворую жанчыну. У яе было моцнае крывяцячэнне. Адзінае, што магло выратаваць яе, — гэта неадкладнае пераліванне крыві.

Намеснік загадчыка абласнога аддзела аховы здароўя тав. Рапапорт, які знаходзіўся ў гэты час у камандыроўцы ў Снядаве, звязаўся па тэлефону з Беластокам. Кароткая размова — і праз дзве гадзіны на снядаўскай пасадачнай аэрапляцоўцы плаўна апускаецца санітарны самалёт. Доктар Высоцкі, які прыляцеў на самалёце, зараз-жа прыступіў да пералівання крыві. Хворая выратавана ад смерці.

Кадры ўрачоў-спецыялістаў

У былой польскай дзяржаве было вельмі мала ўрачоў, асабліва ўрачоў вузкай спецыяльнасці. Таму пасля ўстанаўлення савецкай улады ў заходніх абласцях Беларусі органы аховы здароўя сустрэліся з сур'ёзнымі перашкодамі ў сваёй рабоце.

Усесаюзны інстытут эксперыментальнай медыцыны (ВІЭМ) узяў на сябе абавязацельства ў парадку шэфства павысіць кваліфікацыю ўрачоў, якія працуюць у заходніх абласцях нашай рэспублікі і стварыць кадры спецыялістаў па розных галінах медыцыны. У сувязі з гэтым інстытут прыслаў у заходнія абласці брыгаду навуковых работнікаў.

У Беластоцкай вобласці на працягу 1940—41 года будзе падрыхтавана з ліку мясцовых урачоў 100 розных спецыялістаў (хірургаў, тэрапеўтаў, неўрапатолагаў). Інстытут акажа спецыяльную навуковую дапамогу раду лепшых урачоў і падрыхтуе іх да абароны дысертацый на ступень кандыдата або доктара медыцынскіх навук.

Цэнтральны тэатр лясной прамысловасці ў Беластоку

У Беласток прыбыў на гастролі раз'язны Цэнтральны тэатр лясной прамысловасці. Тэатр створан 6 год таму назад. Ён абслугоўвае работнікаў лясной прамысловасці нашай краіны.

Артыстычны калектыў тэатра складаецца з 35 чалавек. Мастацкі кіраўнік — заслужаны артыст РСФСР — ордэнаносец М. М. Яшнын.

Тэатр пакажа ў Беластоку п'есы: «Бедная нявеста» — Астроўскага, «Прыгонныя»» — Ульянінскага, «Чужое дзіця» — Шкваркіна і т. д.

Рыхтуюцца да прызыву моладзі ў школы ФЗА

ГРАЕВА. (**Ад нашага карэспандэнта**). Тут створана камісія па прызыву моладзі ў рамесленыя, чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна-завадскога абучэння. У горвыканком паступаюць заявы ад моладзі, якая жадае паступіць у ствараемыя школы і вучылішчы.

14-гадовы Ян Лядзінскі піша: «Я жадаю стаць высокакваліфікаваным рабочым. Прашу накіраваць мяне ў адну з рамесленых школ упраўлення дзяржаўных працоўных рэзерваў. Абяцаю закончыць вучобу на «добра» і «выдатна».

Для растлумачэння ў вёсках мэт прадстаячага прызыву моладзі ў рамесленыя вучылішчы і школы ФЗА раённы камітэт комсамола выслаў рад агітатараў у сельсоветы.

—0—

ЦІКАВЫ ВЕЧАР

У 3-яй беластоцкай школе праведзен цікавы вечар з удзелам рабочых-тэкстыльшчыкаў.

Вучаніца 9 класа Яхнін зрабіла даклад аб вызваленні Заходняй Беларусі гераічнай Чырвонай Арміяй. Яна расказала аб тым, «як жылі мы і сталі мы чым», аб велізарных дасягненнях першага года працы пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, аб моладзі, якая настойліва вучыцца.

Разнастайным і цікавым быў паказ вучнёўскай мастацкай самадзейнасці. Вялікае ўражанне пакінуў мантаж, прысвечаны вызваленню. На высокім узроўні былі выкананы песні хорам пад кіраваннем тав. Гаса.

Кляўзнер.

—0—

РЭСПУБЛІКАНСКІЯ СПАБОРНІЦТВЫ Ў ГРОДНЕ І БЕЛАСТОКУ

Згодна рашэння камітэта па справах фізкультуры і спорту пры Соўнаркоме БССР, 19 кастрычніка ў Гродне адбудуцца рэспубліканскія спаборніцтвы па асабістае першынства па боксу. У спаборніцтвах прыме ўдзел каля 70 лепшых баксёраў рэспублікі.

Ад Беластока ў спаборніцтвах будзе ўдзельнічаць шэсць чалавек, сярод іх кандыдат на званне чэмпіёна рэспублікі ў цяжкай вазе тав. Блюм, у лёгкай вазе—тав. Сібірскі і ў найлягчэйшай вазе—тав. Муль.

З 24 па 27 кастрычніка ў Беластоку будуць праходзіць рэспубліканскія спаборніцтвы па французскай барацьбе. Ад беластоцкай каманды выступіць рад мацнейшых удзельнікаў, як тт. Школьнік, Ратокля, Глембоцкі і іншыя.

—0—

ДРАМГУРТОК У ШКОЛЕ

У Міхайлаўскай рускай школе, Заблудаўскага раёна, з першых дзён вучобы разгарнулі работу літаратурны, харавы, музыкальны і драматычны гурткі. Драмгурток паставіў у Міхайлаве і Гарадку п'есу «Гарачае сэрца». Да святкавання гадавіны Кастрычніка драмгурток рыхтуе новую пастаноўку.

Л. Куляшоў.

—0—

АРКЕСТР НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ

Пры беластоцкім Доме народнай творчасці арганізуецца аркестр народных інструментаў (домры і балалайкі).

У састаў аркестра ўвойдуць 25 чалавек з ліку рабочых і служачых беластоцкіх прадпрыемстваў і ўстаноў.

Нам. адказнага рэдактара
Г. М. КУЗНЯЦОЎ.

УБ — 73. Друкарня Беластокдруку.